Дзяржаўная ўстанова культуры
“Жлобінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Н.К. Крупскай”

# Каляндар
# знамянальных і памятных дат і падзей Жлобіншчыны
# на 2024 год

Календарам знамянальных і памятных дат належыць асобая роля ў распаўсюджванні гістарычных звестак аб тым ці іншым краі, людзях, якія яго праслаўлялі, гарадах і вёсках, фабрыках і заводах, установах навукі, культуры, адукацыі. Яны ўваходзяць у склад краязнаўчых рэкамендацыйных даведачных дапаможнікаў і прызначаны перш за усё бібліятэчным работнікам у дапамогу іх шматграннай краязнаўчай дзейнасці, работнікам сродкаў масавай інфармацыі і музеяў, а таксама ўсім, каго цікавіць гісторыя і сучаснасць роднага краю. Матэрыялы ***«Календара...»*** даступныя як для спецыяліста, так і для масавага чытача. У ім адзначаюцца звычайна так званыя «круглыя» даты (150-годдзе, 100-годдзе, 50-годдзе і г.д.). Разам яны адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Жлобіншчыны, юбілейныя даты дзеячоў, жыццё ці дзейнасць якіх звязана з краем.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці з іх значнасцю для гісторыі, грамадскага жыцця, эканомікі, навукі і культуры. У «Каляндар...» уключаюцца наступныя найбольш значныя даты:

- важнейшыя гістарычныя падзеі на тэрыторыі вобласці;
- падзеі, звязаныя з дзейнасцю палітычных партый і грамадскіх арганізацый;
- помнікі прыроды, гісторыі і культуры;
- вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы;
- бібліятэкі, выдавецтвы, старэйшыя перыядычныя выданні;
- тэатры, музеі, творчыя саюзы і калектывы;
- прадпрыемствы і інш.

Уключаецца таксама інфармацыя аб персаналіях, якія прадстаўляюць гістарычны, навуковы ці сацыяльны інтарэс:

- выдатныя мясцовыя дзеячы;
- асобы, знаходжанне якіх у краі пакінула адметны след;
- ураджэнцы краю, якія праславілі Жлобіншчыну за яе межамі.

Пры гэтым указваецца сфера дзейнасці асобы, а пры наяўнасці інфармацыі — вучоная ступень, належнасць да грамадскіх аб'яднанняў, заслугі перад грамадствам (звесткі аб ганаровых прэміях, лаўрэацкіх званнях і г. д.), гады жыцця. Інфармацыя пра ўраджэнцаў раёна дадаткова, уключае месца нараджэння асобы.

Асноўнай крыніцай для выяўлення дат пры складанні “Календара…” з'яўляецца кніга “Памяць: Жлобін і Жлобінскі раён”|, а таксама энцыклапедычныя выданні па розных галінах ведаў, агульныя календары знамянальных і памятных дат, падшыўкі мясцовай газеты “Новы дзень”, біяграфічныя слоўнікі і дапаможнікі, тэматычныя папкі.

Матэрыялы ў «Календары... » падаюцца па новым каляндарным стылі і размешчаны па месяцах і числах. Выключэнне састаўляюць толькі тыя матэрыялы, у якіх не ўстаноўлена дакладная дата (месяц і число). Такія матэрыялы размяшчаюцца ў пачатку календара па гадах.

## У 2024 годзе спаўняецца:

**100** гадоў з часу заснавання (1924) **Жлобінскай метэаралагічнай станцыі.** З 1930 г. стала дзейнічаць па праграме метэастанцый 2-га разраду.

**100** гадоў з дня нараджэння **Рудзенкі Мікалая Васільевіча** (**Руденко**;1924, в. Кірава Жлобінскага раёна – 1994), Героя Сацыялістычнай Працы (1958). Заслужаны механізатар Беларусі.

**55** гадоў з часу заснавання (1969) сельскагаспадарчага прадпрыемства **«Бабоўскі»** ў Жлобінскім раёне на базе калгаса «Зара» падчас разбуйнення саўгаса «Лукскі» і калгаса Кірава. У 2001 г. рэарганізавана ў рэспубліканскае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства, з 2010 г. – ААТ. Адміністрацыйны цэнтр знаходзіцца ў аграгарадку Бабоўка. На тэрыторыі гаспадаркі – 8 населеных пунктаў. Спецыялізуецца на вытворчасцімалака, вырошчванні зерневых і зернебабовых культур, бульбы, буракоў.

**35** гадоў з часу заснавання (1989) **Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея** шляхам рэарганізацыі музея народнай славы**.** Для наведвальнікаў адкрыты 15.02.1992 г. У 2006 г. у якасці філіялаў далучаны мемарыял «Помнік дзецям – ахвярам Вялікай Айчыннай вайны», у 2012 г. – палацава-паркавы ансамбль Козел-Паклеўскіх.

**35** гадоў з часу заснавання (1989) **ансамбля песні і танца «Крыніца»** Беларускага металургічнага завода. Званне «народны аматарскі калектыў» прысвоена ў 1994 г. Лаўрэат Міжнароднага маладзёжнага фестывалю «Арт-сесія» (1996), 1-га Рэспубліканскага фестывалю ансамбляў песні і танца (г. Ліда), 1-га Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці «Беларусь – мая песня» (1998), дыпламант 1-га Міжнароднага фестывалю харэаграфіі «Сожскі карагод», удзельнік шматлікіх свят.

**25** гадоў з часу заснавання (1999) ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння **«Выдрыца»** на тэрыторыі Жлобінскага і Светлагорскага раёнаў. Створаны для аховы ўнікальных ландшафтных комплексаў Беларускага Палесся. Плошча – 17560 га.

**100** гадоў з дня нараджэння **Мартынава Валянціна Сямёнавіча** (1924-10.05.2004), удзельніка Парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. у складзе зводнага палка Карэльскага фронта. Жыў і працаваў у Жлобіне з ліпеня 1946 г.

**30** гадоў з часу заснавання (1994) **Жлобінскага ўзорнага ансамбля народнай песні “Скамарохі”** пры Палацы культуры металургаў. У 2003 г. прысвоена званне “ўзорны аматарскі калектыў”. Асноўныя мэты дзейнасці – развіццё нацыянальных культурных традыцый, вывучэнне традыцыйнага народнага спеву, фальклорнага танца абрадаў царкоўнага і народнага календара. Лаўрэат фестываляў: усебеларускага

народнага мастацтва “Беларусь – мая песня” (г.Гомель, 2004), “Рускі партрэт у беларускім інтэр’еры” (г.Жлобін, 2001, 2010, 2012).

## С Т У Д З Е Н Ь

**2 – 70** гадоў з дня нараджэння **Лазарава Леаніда Аркадз’евіча** (н.2.01.1954, в.Істопкі Жлобінскага раёна), беларускага трэнера (пажарна-выратавальны спорт). Майстар спорту СССР (1980).

**6 – 130** гадоў з дня нараджэння **Мазіліна Піліпа Мікалаевіча** (06.01.1894-01.03.1944), удзельніка вызвалення Жлобіншчыны. У баі за в.Мормаль Жлобінскага раёна закрыў амбразуру дзота сваім целам. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Яго іменем названа вуліца ў в.Мормаль, дзе пастаўлены помнік П.М.Мазіліну і М.П.Жуйкову, які таксама ў гэтым баі сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота. На месцы бою пастаўлены памятны знак.

**15 – 95** гадоў з дня нараджэння **Канаплянікава Аляксандра Дзмітрыевіча (**15.01.1929, в. Саланое Жлобінскага раёна – 1994), Героя Сацыялістычнай Працы (1976). Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1977). Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**21 – 100** гадоў з дня нараджэння **Мартынава Валянціна Сямёнавіча** (21.01.1924 – 10.05.2004), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. у складзе зводнага палка Карэльскага фронту. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 1 ступені, медалямі. Жыў у Жлобіне з ліпеня 1946 г., працаваў машыністам у паравозным дэпо.

## Л Ю Т Ы

**12 – 100** гадоў з дня нараджэння **Капусціна Аляксандра Пятровіча** (12.02.1924, в. Старая Рудня Рагачоўскага раёна – 16.10.1996), беларускага пісьменніка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1974). Ганаровы грамадзянін г.Жлобіна (1983). У яго гонар у Жлобіне штогод праводзяцца Капусцінскія чытанні, заснавана рэгіянальная літаратурная прэмія імя А. Капусціна.

**21 – 80** гадоў з часу правядзення (21 – 26.02.1944) **Рагачоўска-Жлобінскай наступальнай аперацыі** Першага Беларускага фронту (генерал арміі К.К. Ракасоўскі) павызваленню Рагачова і Жлобіна і стварэння ўмоў для наступлення на Бабруйскім напрамку.

**22 – 85** гадоў з дня нараджэння **Бабкова Уладзіміра Андрэевіча** (н. 22.02.1939, ст. Салтанаўка Жлобінскага раёна), беларускага гісторыка і палітолага. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989). Доктар гістарычных навук (1978).

Прафесар (1983). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1999). Аўтар звыш за150 навуковых прац.

**24 – 100** гадоў з дня нараджэння **Фрадкіна Яфіма Самойлавіча** (24.02.1924, в.Шчадрын Жлобінскага раёна – 25.05.1999), расійскага вучонага ў галіне тэарэтычнай фізікі. Заснавальнік навуковай школы па тэарэтычнай фізіцы. Акадэмік Расійскай АН (1990; член-карэспандэнт 1970). Удзельнічаў у стварэнні тэрмаядзернай зброі ў СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1953). Узнагароджаны Залатым медалём імя А.Д. Сахарава Расійскай АН (1996).

## С А К А В І К

**4 – 105** гадоў з дня нараджэння **Лупсякова Міколы (Мікалая Радзівонавіча;** 4.03.1919 – 12.02.1972), беларускага пісьменніка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1944). З 1921 г. жыў у Жлобінскім раёне. Яго імем названа вуліца ў г.п. Стрэшын Жлобінскага раёна. Аўтар кніг «Першая атака» (1946), «Апавяданні» (1947), «Мост» (1947), «Разведчыкі» (1949), «Дружба» (1952), «Чырвоны бераг» (1954), «Зеленая чернильница» (1956), «Дняпроўская чайка» (1957), «Паядынак» (1957), «Домик на колесах» (1957), «У вераб'іную ноч» (1958), «Ля пераправы» (1959), «Прырэчча» (1961), «На Днепре моем» (1961),«В начале жатвы» (1962),«Я помню…» (1964),«На берагах Дняпра» (1966), Выбраныя творы (1968), «Деревенские предания» (1968),«На вірах» (1974),«Міхалаў дуб» (1974) і інш.

## К Р А С А В І К

## М А Й

**2 – 125** гадоў з дня нараджэння **Бажанава Мікалая Данілавіча** (2.05.1899, г. Жлобін – 13.01.1985), члена Саюза пісьменнікаў СССР.

## Ч Э Р В Е Н Ь

**115** гадоў з дня нараджэння **Віхніна Залмана Давыдавіча** (чэрвень, 1909, в. Шчадрын Жлобінскага раёна – 27.09.1943), Героя Савецкага Саюза (16.10.1943). Загінуў у баі пры фарсіраванні Дняпра і вызвалення вёсак Новая Ёлча і Бярозкі Брагінскага раёна. Пахаваны ў брацкай магіле ў Чарнігаве. Яго імем названа вуліца на радзіме – у в. Шчадрын. На Алеі Герояў уЖлобіне яму ўсталяваны памятны знак, у Бабруйску– стэла.

**26 – 80** гадоў з часу вызвалення (26 – 27.06.1944) **Жлобіна і Жлобінскага раёна** ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 2.07.1944 г. ганаровае званне «Жлобінскіх» атрымалі дзвавайсковыя злучэнні і адна вайсковая часць 48-й і 16-й

паветраных армій 1-га Беларускага фронту. У гонар гэтых падзей у Маскве дадзены салют.

## Л І П Е Н Ь

**11 – 45** гадоў з дня нараджэння **Крывіцкай Людмілы Мікалаеўны** (н. 11.07.1979, г. Жлобін) беларускай спартсменкі (хакей на траве, індархакей). Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы па індархакею (2004, Эйндховен, Нідэрланды). Чэмпіёнка Беларусі па хакею на траве (1997 – 2004).

**17 – 100** гадоў з часу заснавання (17.07.1924) **раёнаў: Рагачоўскага –**з цэнтрам у Рагачове, **Буда-Кашалёўскага** – з цэнтрам у Буда-Кашалёве, **Жлобінскага –** з цэнтрам у Жлобіне, **Калінкавіцкага –** з цэнтрам у Калінкавічах, **Кармянскага –** з цэнтрам у Карме**,** **Лельчыцкага** – з цэнтрам ў Лельчыцах, **Мазырскага –** з цэнтраму Мазыры**,** **Нараўлянскага –** з цэнтрам у Нароўлі, **Петрыкаўскага –** з цэнтрам ў Петрыкаве, **Азарыцкага (**існаваў у складзе Мазырскай акругі) з цэнтраму Азарычах.

## Ж Н І В Е Н Ь

**1 – 70** гадоў з дня нараджэння **Грыцкова Леаніда Васільевіча** (н. 1.08.1954, в. Новыя Маркавічы Жлобінскага раёна), беларускага мастака (кераміка).

## В Е Р А С Е Н Ь

**20 – 115** гадоў з дня нараджэння **Барташова Макара Уласавіча** (20.09.1909, г. Жлобін – 7.02.1948), Героя Савецкага Саюза (1945). Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў. Яго імем названа вуліца ў Жлобіне, устаноўлена мемарыяльная дошка.

## К А С Т Р Ы Ч Н І К

**7 – 90** гадоў з дня нараджэння **Станіслававай Галіны Іванаўны** (н. 7.10.1934, г. Гомель - 28.07.2020г. Жлобін), беларускага дзеяча самадзейнага мастацтва, хормайстара. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1981). Стваральнік і кіраўнік Жлобінскага народнага хору.

**15 – 40** гадоў з часу (15.10.1984) увядзення ў эксплуатацыю электрасталеплавільнага цэху **Беларускага металургічнага завода** і правядзення першай плаўкі.

## Л І С Т А П А Д

**25 – 40** гадоў з часу (25.11.1984) афіцыйнага падпісання акта прыёмкі-здачы ў эксплуатацыю **Беларускага металургічнага завода** ў Жлобіне. З 1999 г. – РУП, з 2012 г. – ААТ, з 2013 г. – ААТ «БМЗ – кіруючая кампанія холдынга «БМК». Прадукцыя экспартуецца ў 70 краін свету. У 1996 г. пры прадпрыемстве адкрыты металургічны тэхнікум.

**25 – 105** гадоў з дня нараджэння **Літаш Настассі Іванаўны** (25.11.1919, в. Заброддзе Жлобінскага раёна – 1998), Героя Сацыялістычнай Працы (1966).

## С Н Е Ж А Н Ь

**13 – 105** гадоў з дня нараджэння **Жолтак Валерыяны Канстанцінаўны (**13.12.1919, г. Жлобін – 14.05.2000), беларускай мастачкі. Член Беларускага Саюза мастакоў (1948). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1999).

**20 – 115** гадоў з дня нараджэння **Кавалёва Мікіты Рыгоравіча** (20.12.1909, в. Майскае Жлобінскага раёна – 10.05.1978), Героя Савецкага Саюза (1944). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём «Залатая Зорка», ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыў у Мінску. У 2009 г. Белпошта выпусціла мастацкі канверт, прысвечаны М.Р. Кавалёву.

**25 – 120** гадоў з дня нараджэння **Чавускага Міхася (Майсея Моталевіча;** 25.12.1904, в. Майскае Жлобінскага раёна – 1.07.1984), беларускага пісьменніка. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1957). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі. Аўтар кніг «Крытычны момант» (1954), «Індык на курорце» (1960), «Рука руку мые» (1964), «Чаму ж не смяяцца?» (1969), «Стрэляны Вераб'ёў» (1976), «Фарбамі гневу» (1975).

## *Л І Т А Р А Т У Р А*

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Пад рэд. Пашкова. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996.

2. Кухарев, Н.В. Жлобин: историко-экономический очерк. – Минск, 1975.

3. Падшыўкі раеннай газеты «Новы дзень» за 1974, 1979, 1984, 1989, 1994, 1999, 2004, 2009, 2014, 2019.

4. Памяць: гісторыка дакументальная хроніка Жлобіна і Жлобінскага раена / Пад рэд. Г.П. Пашкова. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2000.

5. Старонкі гісторыі Гомельшчыны: каляндар дат і падзей на 2019 год. – Гомель: Гомельская абласная універсальная бібліятэка імя У.І.Леніна, 2018.

6. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / Пад рэд. І.П. Шамякіна. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1984.

Складальнік: бібліятэкар І катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу *Махкамава Я.В.*